# ЖНІВЕНЬСКІМ РАНКАМ 42-га…

## З успамінаў М.Я.Мешчані, Н.А. Кавалені, А.С.Сцепанюк, в. Бераставічаны

16 ліпеня мы адзначаем вызваленне роднай Бераставіччыны ад фашысцкай акупацыі. Але мала ўжо хто ведае, што вёска Бераставичаны магла паўтарыць страшны лёс Хатыні, нашых Верхаўлян і многіх іншых беларускіх вёсак, знішчаных ворагам. «Мы былі на валасок ад гэтага, - часта казалі бераставічанцы. - Мы ўсе глядзелі смерці ў вочы».

Бераставічаны вядома як вёска-змагарка, жыхары яе, людзі вольналюбівыя, непакорныя, у 30-я гады не мірыліся з прыгнётам польскіх уладаў. Тут вялася актыўная падпольная барацьба, праводзіліся мітынгі, маёўкі, маніфестацыі, многія падпольшчыкі былі кінуты польскай дэфензівай у турмы. Калі ж у Іспаніі ішла вайна супраць устанаўлення фашысцкага рэжыму, у Бераставічанах актыўна збіралі сродкі ў падтрымку гэтай вольналюбівай краіны. У складзе беларускага батальёна на іспанскай зямлі ваявалі і двое з Бераставічан. Адзін з іх - Аляксандр Якімавіч Дзешка…

У Вялікую Айчынную фашысты баяліся «мясцовых камуністаў», збіраліся спаліць вёску, а яе жыхароў расстраляць. І толькі цуд, лічылі тады і лічаць людзі цяпер, выратаваў іх. А можа, міласць Божая?

### «Карнікі акружалі вёску двойчы»



*М. Я. Мешчаня.*

- успамінае ўраджэнец Бераставічан, жыхар райцэнтра, ветэран вайны Мікалай Якаўлевіч Мешчаня. - У нашу сям'ю фашысты прынеслі гора, як толькі ўступілі ў вёску. Мой брат Іван вяртаўся з поплаву, што пад лесам, дахаты: жанчыны разабралі па хлявах калгасных кароў, якіх ён цэлы тыдзень пасля пачатку вайны сцярог, пасвіў. А быў жа стрыжаны пад «нулёўку» - якраз перад гэтым, у суботу, я пастрыг яго. Тая машынка і цяпер ёсць. Каб ведаў тады, чым жа гэта абернецца... Фашысты прынялі Івана за чырвонаармейца і расстралялі. Чорнай хмарай, пешшу, на матацыклах і машынах, яны ішлі і ехалі на ўсход.

… Першы раз акружылі нашу вёску праз месяц. І ўчынілі страшную расправу. Брат мой Васіль быў мабілізаваны разам з іншымі вясковымі хлопцамі ў першы ж дзень вайны. Аднак дабраліся яны толькі да ракі Шчары. Там, на мосце, трапілі пад бамбёжку. Мала хто ўцалеў. А тым, хто ўцалеў, камандзір загадаў: разбівайцеся на дробныя групы і прабівайцеся куды хто можа. Васіль і бераставічанскія хлопцы з ім прыйшлі дамоў. І вось ліпеньскім ранкам мы з Васілём яшчэ спалі на тапчане, я з краю, ён ад акна. Раптам - вокрык з дзвярэй: «Васіль ёсць?» Ён і слова не паспеў сказаць, як рванулі з

пасцелі, выкінулі за парог. На дварэ - кулямёт, у вёсцы поўна фашыстаў. Усім нам загадалі сядзець у хаце. А каля хаты Валейкаў паставілі тапчан. Глядзім, ажно кідаюць на яго мужчын і хлопцаў, моцна б'юць палкамі па спінах. А збіўшы да непрытомнасці, скідваюць побач у глыбокую яму, з якой уся вёска пясок брала. Потым, ачуняўшы, яны выпаўзалі з той ямы. Цераз наша акно ўсё відаць было, і маці, гледзячы, млела і млела. Думалі, і Васіль наш там, у той яме. Але горшая доля яго чакала. Разам з Антонам і Фёдарам Дзешкамі (Фёдар нямым быў), Міхаілам Акулічам, Іванам Калеснікам яго ўзялі пад канвой, завялі ў лес і прымусілі капаць яму. Расстрэльвалі па аднаму. Усіх расстралялі, адзін Міхаіл Акуліч цудам уцалеў.

Потым у вёсцы казалі: ўсе яны былі кімсьці заўданыя фашыстам за тое, што быццам бы расправіліся са здраднікамі, якія выдалі польскай дэфензіве актыў падпольнай арганізацыі. Так, хутчэй за ўсё, яно было, бо і білі людзей па спісках, і расстрэльвалі, зачытваючы прозвішчы. Тут жа стаялі і тыя, каго нашы бацькі ведалі як служакаў польскай дэфензівы, а ў вайну яны сталі служыць фашыстам. Што ж, у цяжкія часы ліхалецця праяўляецца не толькі мужнасць, але і ўсякае зло лезе, выпірае наверх...

...У другі раз карнікі наляцелі на вёску ў пачатку жніўня 42-га. Бачыў і помню, як яе акружалі. З дзедам Данілам мы выгналі кароў, як звычайна, вельмі рана. Наваколле ахутваў першы жнівеньскі туман. Не паспеў ён яшчэ рассеяцца, як пачуўся гул матораў, потым нямецкія каманды. Салдаты ўстанавілі на ўскрайку вёскі кулямёт, казалі людзі потым, што і ў другім канцы - таксама. Калі пачалі акружаць вёску, дзед Даніла зняў шапку, перахрысціўся. «Бяда, хлопча, бяда, - казаў ён. - Бяжы, у лес хавайся. І здымі ты гэту цацку з грудзей сваіх!» А ў мяне на пінжачку быў прышпілены піянерскі значок.

Потым у вёсцы чуліся крыкі, жаночы і дзіцячы плач, брахалі сабакі. У самой вёсцы я не быў, ад родных ужо даведаўся, які жах стаяў там. Немцы зброю шукалі. Знойдуць, сказалі - усю вёску знішчаць. Мужчыны і не спадзяваліся на жыццё: знойдуць, не знойдуць фашысты зброю, усё роўна ў жывых не пакінуць. Камуністамі ўсіх нас лічылі, пасобнікамі партызан. Але чамусьці, перавярнуўшы ўсё ў сядзібах, паехалі назад у Бераставіцу.

Пацярпела ўсё ж наша вёска ад фашыстаў. Сорак шэсць хлопцаў і мужчын на фронт пайшлі, трынаццаць не вярнуліся. Шэсць чалавек у вёсцы расстралялі. І я, і ўся наша вёска ніколі не забудзем таго, што давялося перажыць у вайну. Такое забыць нельга…

## «Мог паўтарыцца страшны лёс Верхаўлян»

- Жнівень 42-га стаяў спякотны: сама жыта жалі, - расказвае Ніна Аляксееўна Каваленя. - Не помню, ці то нядзелька была, ці то будні дзень. Можа і нядзелька, бо ўсе былі ў хатах. Ранкам у вёску, бы тыя шулякі, наляцелі фашысты. Мачыха глянула ў акно і здранцвела. «Быць бядзе!..» - запрычытала.

Тут маленькая Галечка як зойдзецца плачам. Ёй пару месячыкаў было, а дзіця быццам адчула нядобрае. Усе мы стаіліся. У хаце – пяцёра дзяцей: я, два мае родныя браты і малодшанькія, дзеці таты і мачыхі - Міша і Галечка.

- Выходзьце з хаты! - чуем голас паліцая. Потым грукаюць у дзверы і з лёскатам расчыняюць іх. На парозе - фашыст з аўтаматам: «Шнэль! Шнэль!». Ніколі не забуду тое страшнае вока аўтамата, настаўленае на нас. «А Божухна!» - войкае мачыха і ледзь не траціць прытомнасць. Потым хапае нейкія пажыткі, хлеб са стала і нам паказвае, каб звязвалі сабе клуначкі. Але дзе ж там… Мы не паспяваем і ў рукі штосьці ўзяць - фашыст аўтаматам выганяе ўсіх з хаты. Выбеглі мы на вуліцу, а там ужо плач стаіць, гоняць суседзяў, людзей з іншых хатаў. Мужчын немцы адрывалі ад сем'яў, накіроўвалі ў іншы бок. Як потым стала вядома, іх трымалі пад аўтаматамі каля глінянага гумна дзядзькі Акуліча.



***Н. А. Каваленя.***

Жанчын з дзецьмі пагналі на балоцісты выган, што непадалёк ад дарогі. Ён і сёння ёсць, там дзядзькі Максіма Кавалені гумно стаяла. Да таго гумна нас і сагналі ўсіх. Чаму ўсіх выгналі з хатаў? Што хочуць зрабіць з намі фашысты? Мы, падлеткі, не зусім разумелі, што дзеецца. Мне яшчэ і пятнаццаці не было. А бабы, дзеўкі, старыя бабулі ўсё плакалі і галасілі. Казалі, хочуць зрабіць у нас другія Верхаўляны. Хадзілі чуткі, што там хаты спалілі, а мужчын расстралялі.

Усіх нас трымалі пад прыцэлам. Нікуды не ўцячэш: стаяць салдаты, тут жа аўчарка. Непадалёк жыта, можна дапаўзці і схавацца - але аўчарка рэагавала на кожны рух.

Салдаты па дварах з аўчаркамі разбегліся. Адзін фашыст, мусіць, галоўны іхні, нешта ўсё выкрыкваў, пагражаў. Глафіра Жлабовіч разумела па-яўрэйску, яна і ўчула, што зброю шукаюць. І як толькі знойдуць хоць што-кольвек, усіх нас і праўда расстраляюць, а вёску спаляць. Людзі як пачулі тое, рухнулі бегчы, уцякаць. Немцы стрэлілі ўгору.

Цяпер успомню, і дранцвее ўсё: што на тым балоцечку рабілася! Маці як сшалелі, тулілі да сябе дзяцей, галасілі, маліліся Богу. І ўцячы не ўцячэш, і дзе ж мужчыны, што з імі зробяць? Галечка наша не сціхала, усё плакала і плакала, а тут і Мішка загаласіў. Мяне ж пачало ліхаманіць. Божа, ніколі ў жыцці так не трасло, як тады. На дварэ спякота, а зуб на зуб не трапляе... у галаве ж свідравала думка: «Якая зброя? У каго яна ёсць? Як гэта мяне расстраляюць? І што - я не буду болей жыць?!!» Але сумненняў не было: знойдуць хоць адзін патрон - расстраляюць. Праз гады зразумела, якую ж пакуту перажылі жанчыны, тулячы да сябе дзяцей. Паўдня нечалавечай пакуты. Потым, ужо пад абед, на двух матацыклах прыехалі немцы з пераводчыкам, загадалі нам: «Ідзіце дахаты!» Значыць, дзякаваць Богу,

нічога не знайшлі. Мы ў сваёй хаце, і ў хляве, і ў гумне засталі ўсё перавернутым уверх дном, перапораным.

...Не ведаю, што нас усіх тады выратавала. Помню толькі, як адна бабуля ўпала на калені і малілася. Божа, як жа яна малілася! Здавалася, тыя словы ляцяць проста ў неба, і такія яны былі жаллівыя, такія гарачыя, што хацелася чамусьці верыць: самае страшнае не здарыцца. І ўсе старэйшыя жанчыны, і маладыя матулі прасілі ў Бога дапамогі, шапталі малітву. На яго толькі спадзяваліся…

## «Ніхто ўжо не спадзяваўся, што застанецца ў жывых»

У нашай сям'і пяцёра дзяцей было. І ў кожнай жа хаце вялікія сем'і, - успамінае той акупацыйны час Анастасія Сцяпанаўна Сцепанюк. - Уявіце сабе, што ў вёсцы рабілася, калі выгналі ўсіх людцоў на вуліцу ды пад тымі аўтаматамі пагналі на луг, да гумна! Мужчын асобна аддзялілі. Усе плакалі, мацеркі малых дзяцей на руках няслі, большыя за спадніцы трымаліся. Падшпаркі, старыя бабулі - усіх выгналі. І ўсе ведалі, што не на дабро гэта. Немцы пад гумном нас акружылі. І дзе ты ўцячэш?! Многія жанчыны млелі. Потым казалі, што Глафіра Жлабовіч старалася неяк дзяцей ўратаваць. Яна баявая, адважная была, і у яўрэя ў Беластоку за польскім часам служыла і мову іх ведала. А яўрэйская ж мова з нямецкаю быццам схожая. Дык во, Глафіра з немцамі ўсё загаворвала, прасіла злітавацца, а сама бабам наказвала, каб дзяцей як-небудзь угінкам за гумно, у збажыну адпраўлялі. Туман яшчэ стаяў. Быццам і ўцякалі некаторыя дзеці. Хаця не ведаю, немцаў жа многа было, ды з сабакамі. А мо каму яшчэ з хаты ці вуліцы ўдалося ўцячы. Казалі, праўда, што некаторыя сем'і потым дзяцей ў жыце і ў лесе знаходзілі.



***А.С.Сцепанюк.***

Такі жах перажылі, не дай Бог! Ніхто ні на мінуту не думаў, што ў жывых застанецца. А пра мужчын ў натоўпе нашым казалі, што іх адразу забралі і павезлі казніць. На шчасце, няпраўда гэта была.

Як шалёныя, лёталі фашысты па хатах, хлявах, гумнах, руйнавалі ўсё, вываручвалі, раскідвалі. А як жа! Камуністы мы тут, бачыце, усе, аўтаматаў-кулямётаў назапасілі, з партызанамі сувязь трымаем. Нелюдзі яны, майго татку расстралялі проста ў полі. Фама Хілюта загінуў. У Германію колькі людзей забралі! Мяне ў 43-ім вывезлі, парабкавала.

Ну, а там, каля гумна, проста пашанцавала нам. І мужчынам нашым... Мусіць, адвяла бяду нейкая сіла, бо фашысты былі, як вядома, хуткія на расправу. Па-ўсякаму казалі тады дарослыя. Мабыць, Бог усё ж нас уратаваў, заступіўся…

Марыя Драпеза, в. Бераставічаны,
2008 год.